


## ЯШЧЭ РАЗ ПРА КАХАННЕ... ...І САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН

Люда з Марынай, хоць і вучыліся ў адным эканамічным каледжы, пасябравалі куды пазней, калі прыехалі працаваць у адзін калгас і пасяліліся побач у новых тыпавых катэджах, што будаваліся тады для маладых сем'яў.

Іх мужы — інжынер з аграномам — таксама хутка сышліся, што, вядома ж, добра, бо «радня — збоку, а сусед на воку».

Так казала Марынiна бабця, а ўнучка дык проста рада была — нават таму, што суседзі зусім іншыя — па тэмпераменце, па стаўленні да жыцця. Марына — спакойная, разважлівая, сціплая, любіла корпацца ў градках і вырошчваць кветкі, маляваць пейзажы, з задавальненнем шыла і вязала. Людміла ж якраз наадварот — віхурай насілася па сваёй сялібе, каб хутчэй управіцца з домам-гаспадаркай і каб потым кудысьці матнуць. Яна пастаянна нешта купляла і мяняла: сукенкі, спадніцы, абутак, прычоскі, посуд, мэблю, гардзіны...

— Нельга так жыць! — бушавала зрэдку і ў доме суседкі. — Ну скажы мне, колькі гадоў вось гэтым шпалерам? Шэсць?! Ды гэта ж з глузду з'ехаць! Яны што — вам не абрыдзелі?.. А прычоска? Марыначка, паслухай: дакуль ты будзеш хадзіць з гэтым хвосцікам?! — выпытвала Люда, у суседскім люстэрку разглядаючы сваю новую стрыжку. — У цябе ж валасы гусцейшыя за мае, а хіба так скажаш?..

— Дык шпалеры ж мы куплялі добрыя, — нясмела пярэчыла Марына. — За шэсць гадоў з імі нічога не сталася. Дык навошта мяняць?.. І з валасамі клопатаў няма: я іх зранку ў гульку скручу ці хвост завяжу і хаджу сабе...

— Ай, і сама ты нічога не разумееш, і муж у цябе такі ж, — махала рукой Людміла ды ішла дамоў, да свайго Алега.

Ён — вясельчак, «прыкаліст», заядлы футбольны балельшчык — таксама быў непаседам, душой кампаніі, чалавекам-святам, і Марына (не без таго, здаралася...) часам зайздросціла свaёй суседцы, а найбольш — калі тая ў чарговы раз хвалілася (што-што, а гэта яна любіла!), якую дарагую парфуму Алежка падарыў ёй «проста так», без нагоды, які сюрпрыз падрыхтаваў да дня нараджэння і як часта гаворыць ёй аб тым, што яна — самая-самая: каханая, прыгожая, разумная, — найлепшая!

— А мой, — уздыхала Марына, — казаў, што кахае, лічаныя разы: калі замуж клікаў, калі дзяцей нарадзіла ды калі моцна захварэла... О-о! І яшчэ адзін раз — калі не стала сварыцца, што мотаблок купіў — замест хaладзільніка... Пярсцёнкаў ды парфумы ён таксама ніколі не дарыў. Сказаў: калі хочаш, — сама выбірай, а я лепш нешта патрэбнае куплю, каб лягчэй жылося — тую ж мультыварку, кухонны камбайн, машыну, каб посуд мыла...

— Паслухай, — перабівала Людміла, — дык гэта ж маветон! І гэта — зусім не падарункі! Імі твой Саша гаворыць, што ты ў доме — работніца, прыслуга... Каб мой Алежка такое падарыў, я б яму!..

Рассудзілі жанчын — ну вядома ж — час і выпадак. Неяк летнім надвячоркам суседкі пайшлі за вёску — сталі палоць там бульбу.

Люда здалася першая: ледзь не адразу пазваніла мужу, сказала, што ў зямлю з матыкай проста не ўлезці (ведама, гліна, дажджы...), папрасіла, каб ён прыйшоў, дапамог.

— Золатка, я не магу, ну ніяк! — забарабаніў Алег. — Ты ж ведаеш, які сёння матч?! Ты ж разумееш: я павінен яго ўбачыць!.. Ну, праўда...

Пачуўшы мужава «прабач», Люда моўчкі шпурнула тэлефон на ўзмежак і з запалам, памножаным крыўдай, узялася матычыць бульбу.

Саша з'явіўся на полі хвілін праз дзесяць.

— Казаў жа: не трэба нам гэтыя «соткі»! — стаў даводзіць жонцы яшчэ здалёк. — Дык жа не — загарэлася, узяла! Бульбы табе не хапае... А цяпер во — палі, душыся...

— Дык я ж цябе не клікала, я спраўлюся, — паспрабавала «адбіцца» Марына.

— Бач ты — яна не клікала! А потым цiск падскочыць!.. Давай сюды матыку! Ідзі дамоў!.. Я там, пакуль машыну правіў, курыцу ў духоўцы запёк. Паеш ды адпачні... Памідоры я паліў.

Марына і сапраўды сышла дадому, Людміла — засталася.

Немаведама аб чым тады думала, але ж хваліцца тым, як моцна Алег кахае яе і які ён сапраўдны мужчына, перастала. Перад Марынай — дакладна.

**Алена Несцяронак,**
*г. Докшыцы.*

## ЗНАТНЫ ПАЧАСТУНАК

Некалі, у васьмідзясятых гадах мінулага стагоддзя, аптэка ў нашых Расонах свайго будынка не мела — тулілася ў пакоях бальніцы. Сёння ўжо іншая справа: і сцэны свае, і калектыў, і практыканты — часам...

Вестку аб тым, што на гэты раз прыязджае студэнт з Эфіопіі, загадчыца, па чутках, прыняла з насцярогай. З аднаго боку, як быццам добра, што моладзь з такіх далёкіх краін едзе да нас вучыцца, а з іншага — як паразумецца з гэтым хлапцом? Як зрабіць, каб не ачмурыў тут некага з дзяўчат ды не звёз у сваю Эфіопію?..

Карацей, вочы ў страху былі па яблыку! А на справе ўсё аказалася значна прасцей, бо студэнт досыць добра ведаў рускую мову, нядрэнна разбіраўся ў лекаx-прэпаратах і дзяўчыну, мусіць, меў сваю, бо на тутэйшых не дужа заглядаўся.

...Заставалася праблема з жыллём, але і яе ўдалося ўладзіць. Адзінокая гаспадыня з дамка паблізу пагадзілася выдзеліць практыканту асобны пакой. (На тое, што бабулю падводзіць слых, ні загадчыца аптэкі, ні студэнт увагі не звярнулі: ну спытала, як завуць кватаранта. Ну перапытала... Уздыхнула...)

Час практыкі — і адпаведна, пражывання — для ўсіх праляцеў хутка. На развітанне гаспадыня накрыла стол: насмажыла бульбачкі, нарэзала смачнай каўбаскі, дастала са склепа сваіх загатовак: чым магла — частавала.

Але студэнт, можа, негалодны быў, можа, трохі саромеўся ці не ўсё ўпадабаў, але ж еў да крыўднага мала... «З'едзе ў сваю Эфіопію, — перажывала бабуля, — ды яшчэ раскажа, што тут яго дрэнна прымалі, што прымусу не было».

А таму якраз на яго бабуля і «націскала», час ад часу паўтарала: «Ты ж еш, Барсік, еш!» — «Іванаўна, — не вытрымаў урэшце хлопец, — я ніякі не Барсік. Мяне завуць Абас!»

Гаспадыня, здаецца, пачула гэтае імя, згодна заматляла галавой, але ж па-ранейшаму (хай сабе і моўчкі) частавала, карміла Барса. Так ёй было прывычней.

**Аляксандр Матошка,**
*Расонскі раён.*

## МАКІЯЖ ДЛЯ МАМЫ

У тую вясну ўвесь участак на сорак «сотак» Феня засадзіла бульбай, хацела, разлічвала на добры ўраджай, аднак асот так шчыльна «ўссеў» на градкі, так абляпіў маладыя кусцікі...

«Трэба ратаваць», — сама сабе сказала гаспадыня і раніцай, пакуль дзеці спалі, выйшла ў поле. Яна, як ні дзіўна, любіла палоць, любіла потым азірацца назад...

Але ж сонца падымалася ўсё вышэй і вышэй, пачынала прыпякаць — ды так, што працаваць было амаль немагчыма. Да таго ж хутка маглі прачнуцца дзеці, трэба было гатаваць сняданак.

Таму Феня, ледзь разагнуўшыся, выцерла хустачкай твар і пайшла ў кухню — пячы блінцы. Падмазкай хутка кружляла па гарачай патэльні, мернай лыжкай боўтала асеўшае цеста, тут жа налівала яго, трымала над гарачым вуголлем, спрытна пераварочвала: патэльня снавала з печы на прыпек і назад у печ. На вялікай талерцы, як бачыш, уздымалася горка блінцоў.

Да іх Феня паставіла слоік смятаны і пайшла падымаць дзяцей.

Усе разам яны смачна паснедалі, Феня, загадаўшы малым, каб ні кроку са двара, прыбрала, памыла посуд і прылягла — усяго на мінуту.

Дзеці тым часам засталі цацкі, знайшлі сярод іх «чароўны» хімічны аловак. Добра паслініўшы, бо інакш ён зусім не маляваў, Толя падвёў, падправіў ім вочкі сястрычччынай ляльцы Марусі. Хораша атрымалася! «Вось бы і мамцы так!» — падумаў малы.

А пасля і праўда падышоў да ложка, паслініў аловак, крышку паправіў, падвёў адно брыво, палюбаваўся, зноў паслініў аловак — падвёў другое... Твар матулі паступова мяняўся і, вядома ж, да лепшага, ва ўсякім разе бровы станавіліся ўсё шырэйшымі і шырэйшымі, сінейшымі і сінейшымі (хімічны аловак маляваў толькі так і, дарэчы, вельмі дрэнна змываўся)...

Падмалёўваць вочы Толя ў той раз не ўзяўся, пабег гуляць.

...Стома брала сваё: маці, прачнуўшыся, паглядзела на гадзіннік і выйшла на двор. Там, каля весніц, ужо збіраліся суседзі з вёдрамі-дайніцамі.

Феня з плота зняла сваё, на дно яе паклала кавалак марлі, якім абвязвала ўдой ды лусту хлеба для кароўкі, рушыла на вуліцу.

— Слухай, а ты ў люстэрка глядзелася? — з рогатам спытаў сусед.

— Не, Паўлічак, часу не было: з пяці гадзін сёння бульбу палола... А што? — разгублена залапатала Феня. — Чаму ты пытаешся?

Павел дастаў з кішэні маленькае люстэрка — паднёс да твару суседкі.

— А божухна! — глянуўшы туды, ускрыкнула Феня. — Я, што, так моцна заснула? Не чула, як мяне размалёўвалі? Во мастакі! Я ж ім пакажу!

З гэтымі словамі жанчына рынулася ў хату, і адтуль — амаль тут жа — трымаючы штонікі, куляй вылецеў смігадовы «мастак».

...Вось так, можна сказаць, не пачаўшыся, скончыўся «творчы шлях» мо найлепшага мастака-візажыста нашай вобласці.

**В. Бабко-Аляшкевіч,**
*Салігорскі раён.*




**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# «Добры вечар, махляр!»,

## або Вучыцца лепш на чужых памылках

Мы сядзелі ў пятніцу вечарам у кавярні ў прыемнай дзявочай кампаніі, размаўлялі пра жыццё. І тут у мяне зазваніў тэлефон. Званок быў на «ватсап», нумар пачынаўся +63 (пасля высветліла, што гэта Філіпіны). «Ціха, дзяўчаты, мне махляры звоняць!» — прыкрыкнула на шумную кампанію. «Махляр, махляр!» — радасна зашапталі сяброўкі і сціхлі. «Добры вечар, махляр!» — урачыста сказала, зняўшы трубку. Махляр спачатку ніяк не збянтэжыўся (можа, добра не пачуў?) і пачаў прафесійна пастаўленым, надзвычай сур'ёзным голасам, звяртаючыся да мяне па імені, расказваць, што ён са следчага ўпраўлення МУС, што на маё імя махляры спрабуюць узяць крэдыт... «Пакайце-пакайце, махляр! А чаму вы звоніце на месенджар ды яшчэ з іншай краіны?» Ён зноў не адрэагаваў на маё здзеклівае «махляр» і зноў ну вельмі сур'ёзна пачаў тлумачыць, што ўсё робіцца дзеля таго, каб махляры (так і сказаў!) не прасачылі наш званок і не саскочылі. «Паслухайце, махляр. Я ведаю, хто вы і чаго тэлефануеце. Не трацьце ні свой, ні мой час». «Спрытна ты яго адшыла!» — сказалі сяброўкі. І наш прыемны вечар ператварыўся ў вечар успамінаў пра ашуканцаў і ашуканых.

Што больш за ўсё ўразіла — у кожнай з нас была свая гісторыя камунікацыі з махлярамі. У кожнай, высветлілася, ёсць знаёмыя або сваякі, якія «падзяліліся» з ашуканцамі сваімі грашыма. Прычым гісторыі і выпадкі былі розныя, што сведчыць аб надзвычайнай вынаходлівасці людзей, якія спрабуюць нашы грошы забраць. Я вырашыла гэтыя пачутыя з першых вуснаў гісторыі тут прыгадаць, хоць пра іх пішуць і гавораць ледзь не на кожным кроку. Нават калі адзін ці два чалавекі, прачытаўшы іх, не дазволяць сабе папоўніць спісы ахвяр, можна будзе лічыць, што зрабіла я гэта недарэмна.

Гісторыя першая. Як чорт з куфра. Маці дваіх дзяцей вырашыла прадаць яшчэ добрыя дзіцячыя адзенне і абутак на «Куфры». Выставіла на продаж курткі, красоўкі, боты. Пакупніца знайшлася вельмі хутка, прычым гатова была купіць усё адразу. Адна была загвоздка: пакупніца не магла забраць тавар сама, бо жыла недзе пад Брэстам, таму прапанавала выслаць яго па пошце пасля аплаты. Аплату яна гатова была пералічыць на карту, трэба было толькі рэквізіты гэтай самай карты даць. Што прадаўшчыца і зрабіла і пачала чакаць паступлення. Праз колькі часу прыйшло апавяшчэнне з банка, толькі не пра паступленне, а пра спісанне з карты ўсіх сродкаў (а было там пад тры тысячы рублёў). Жанчына кінулася шукаць «пакупніцу» ў тэлефонных нумарах, ды на «вайберы» (а камунікавалі менавіта па ім, бо нібыта так танней) і следу ад яе не засталося — зніклі і званкі, і перапіска, і, адпаведна, нумар. І з чым было ісці ў міліцыю? З паведамленнем ад банка аб спісанні сродкаў?

Гісторыя другая. Банк, ды не той. Брат сяброўкі вырашыў аплаціць праз інтэрнэт-банкінг падатак. Загнаў у пошукавы радок назву банка, клікнуў першую прапанаваную гуглам спасылку. Трапіў адразу на анлайн-аплату. Не здзівіўся, што банк прапанаваў па-новаму зарэгістравацца, падумаў, што дзеля бяспекі. Увёў і рэквізіты карты, ажыццявіў аплату таго падатка. Прынамсі, так паведамілі на старонцы. Пайшоў у краму купіць цыгарэт, стаў расплачвацца картай. А прадавец яму: «Недастаткова сродкаў на карце». Кінуўся да банкамата, які там жа ў краме стаяў, паглядзець баланс — а на балансе нуль рублёў нуль капеек. Замест пяці з паловай тысячы, якія да гэтага былі. Кінуўся шукаць канцы — а старонкі той пошук ужо не выдае. Цяпер, ужо дасведчаны, сябе папракае: варта было паглядзець адрас той старонкі, ці няма якой лішняй літары ці кропкі. Ці хоць паспрабаваць перайсці на галоўную — як правіла, на махлярскіх схемах усе астатнія старонкі не актыўныя... Досвед, можа, і карысны, але ж цана за яго завышаная.

Гісторыя трэцяя. «Дапамажыце дзіцяці!» Жанчына «сядзела» ў «Аднакласніках» і прачытала там адну жаласную гісторыю. Пра хлопчыка, які застаўся сіратой пасля пажару ў нейкай палескай вёсцы, а сам моцна абгарэў, і цяпер яму патрэбна аперацыя, якую нашы медыкі зрабіць не могуць — трэба ехаць у Ізраіль. Да паведамлення прыкладаліся фота знявечанага малога і рахунак, на які трэба пералічыць грошы. Тут жа былі дзясяткі каментарыяў: пісалі і тыя, хто пералічыў дапамогу, і тыя, хто яе збіраў, — дзякавалі. Як было застацца ўбаку? Жанчына пералічыла сто рублёў — надта ж жаласнае было фота. Якое ж напаткала здзіўленне, калі ў «Фэйсбуку» ўбачыла тое ж фота, толькі з іншай гісторыяй: забінтаваны па вочы хлопчык, аказваецца, пацярпеў у жудаснай аварыі недзе пад Віцебскам, бацькі загінулі, бабулі не хапае сродкаў, каб яго дагледзець і лячыць... Западозрыўшы нядобрае, жанчына расказала гэта сыну-студэнту, які вучыцца на праграміста. Той вельмі хутка адзваніўся: «Цю-цю твае сто рублёў!» Фота аказалася ўзятым з вядомага інфармагенцтва: на ім хлопчык, што пацярпеў пры землетрасенні ў Турцыі. Рахунак, на які жанчына перавяла грошы, — за межамі нашай краіны...

Гісторыя чацвёртая. «Як пад гіпнозам». Мужу прыяцелькі пазванілі па «вайберы», прыблізна так, як мне па «ватсапе». Што характэрна — чалавек ён сур'ёзны і пра ўсе махлярскія схемы ведае. Але тут... «Ён пасля прызнаваўся, што голас «следчага», які раскрываў махлярскую схему крэдыту» быў настолькі варты даверу, заваражваў, што ён нічога не мог яму пярэчыць. І толькі калі пачаў пераходзіць па спасылцы, якую скінуў яму «следчы», нешта як штоўкнула ў галаве і ў апошні момант спыніўся. Нумара на «вайберы» ўжо не было, але першыя лічбы ён запомніў. Паглядзеў — гэта быў код Малдовы...»

Што яшчэ дадаць да гэтых гісторый, і без таго павучальных? Будзьце пільнымі! Не размаўляйце па тэлефоне з незнаёмцамі. А калі вельмі карціць даведацца, хто ж гэта і з чым звоніць, зняўшы трубку, павітайцеся: «Дзень добры, махляр!» Лепш папрасіць пасля прабачэння ў сумленнага чалавека, чым кусаць локці і глядзець на нуль на рахунку.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**